## Вчера в Минске открылась Международная выставка «Белагро-2019»

Торжественное открытие международной специализированной выставки «Белагро-2019» состоялось вчера в агрогородке Щомыслица Минского района, сообщает БЕЛТА. Участие в выставке примут более 550 компаний из 29 стран. На открытой площадке можно ознакомиться с современной сельскохозяйственной техникой. В частности, широко будет представлена техника для внесения удобрений и защиты растений, для уборки зерновых и заготовки кормов, возделывания и уборки картофеля и овощей. Сельскохозяйственная продукция, машины, оборудование демонстрируется в технологической цепочке с современными энергосберегающими технологиями всех отраслей, связанными как с производством продукции, так и с ее переработкой, транспортировкой, хранением.

Параллельно с белорусскими производителями свои разработки продемонстрируют зарубежные компании. Традиционно проходит и выставка ретро-техники.

Одной из главных новинок нынешнего года стала инновационная экспозиция «Экспериментальное поле». Сорта зерновых культур здесь были посеяны в сентябре 2018 года. На выставке можно будет увидеть, сравнить и оценить всходы экспериментальных сортов озимой пшеницы, тритикале, ржи и ячменя, которые представляет НПЦ НАН Беларуси по земледелию, а также немецкие компании.

Ежегодно «Белагро» становится одной из главных площадок для деловых переговоров. Нынешнюю выставку посетят более 30 официальных делегаций.

# Новыя рубяжы чэмпіёна краіны Мікалая Рэмянькова

**Нагадаю: у мінулым годзе педагог дадатковай адукацыі ЦТДзіМ Мікалай Рэмянькоў стаў абсалютным чэмпіёнам Беларусі па паўэрліфцінгу сярод людзей з праблемамі апорна-рухальнага апарата сярод мужчын, выканаўшы класічны жым у 170 кг. І вось у чарговы раз ён пацвердзіў гэты вынік на адкрытым чэмпіянаце РБ, зноў заваяваўшы золата і не толькі. Упершыню, акрамя сілавога трохбор'я, Мікалай прыняў удзел у другім відзе барацьбы – армрэстлінгу. І атрымаў сярэбраны медаль.**



– Гадоў дзесяць таму спрабаваў сябе ў армрэстлінгу. Але потым больш засяродзіўся на штанзе, таму больш увагі ўдзяляў менавіта гэтаму накірунку. А тут падумаў, чаму б не паспрабаваць сябе ў нечым іншым, новым. Думаю, для першага раза нядрэнна атрымалася, – дзеліцца суразмоўца.

Пры сустрэчы Мікалай Рэмянькоў весела жартуе, ды ведаю – за яго перамогамі стаіць штодзённая, карпатлівая, напружаная праца. Але, дзякуючы добрай групе падтрымкі – дзеткам і любімай жонцы, ён дасягае такіх добрых вынікаў. Таму, свае чарговыя перамогі Мікалай Міхайлавіч прысвячае менавіта ім, сваім самым любімым і блізкім людзям, ну і, безумоўна, любімаму прыбесядскаму краю.

На дасягнутых выніках ён спыняцца не збіраецца. Трэнер Рэспубліканскага Цэнтра Алімпійскай падрыхтоўкі па паралімпійскіх відах спорту Аляксандр Бацян – бачыць у хоцімскім чэмпіёне добры патанцыял, таму прэзентаваў для трэніровак сапраўдную алімпійскую штангу. Зараз яна часткова знаходзіцца ў спортзале Цэнтра творчасці, і Мікалай з баявым настроем гатовы прыступіць да трэніровак. Цяпер у планах новы рубеж: да наступнага спаборніцтва ўзяць 180 кг.

Мы, землякі, ганарымся высокімі дасягненнямі Мікалая Рэмянькова, яго мужнасцю і вытрымкай, і будзем чакаць новых, яшчэ вышэйшых вынікаў.

**Вольга ЗАЙЦАВА**

**Зайцава, В.** Новыя рубяжы чэмпіёна краіны Мікалая Рэмянькова / Вольга Зайцава // Шлях Кастрычніка. — 2019. — 5 чэрвеня. — С. 1.